# ПАДАТКААБКЛАДАННЕ У ДЗЯРЖАВАХ-КНЯСТВАХ НА ТЭРЫТОРЫ1 БЕЛАРУС1

**І. У. В1шнеуская**

*Беларуси дзяржауны эканамічны утверётэт*

Адной з прыкмет дзяржавы з'яуляюцца падаткі, якія спаганяюцца з насельніцтва ва установленых памерах і у вызначаныя тэрмшы.

Падаткаабкладанне і зборы з насельнщтва абумоулены тым, што дзяржава, выконваючы функцыі па падтрыманні правапарадку унутры кра1ны, арганізацыі абароны ад знешняга ворага, рэалізацыі сацыяльных праграм, утрыманш апарата кіравання, мае патрэбу у матэрыяльным забеспячэнні сваёй дзейнасці.

С^тэма падаткау, якая існуе у той щ іншы перыяд, залежыць ад эканамічнага і сацыяльна-палітычнага развіцця самой крашы. У дзяржавы з шзшм узроунем эканамічнага развіцця у падатковай сістэме робіцца акцэнт на ускосным падаткаабкладанні.

У раннім сярэдневякоуі, калі феадальныя адносіны былі слаба развиты і адсутнічала феадальнае землеуладанне, падатш выступалі у выглядзе прынашэнняу, натуральных павіннасцей. Князь і яго дружына абкладалі свабоднае і паусвабоднае насельніцтва данінай, памер якой не быу рэгламентаваны.

Першапачаткова асабісты даход князя амаль што цалкам злЬвауся з фінансавымі сродкамі дзяржавы, таму што штарэсы князя у асноуным супадалі з інтарэсамі дзяржавы (ваенная абарона крашы). Невыпадкова 1/3 частка даходу, яш фарміравауся ад збору даніны і пошлш, ішла на асабістыя патрэбы князя, а 2/3 - на дзяржауныя патрэбы [1, с. 104].

Разам з тым існавалі і экстраардынарныя падатш, яшя прызначаліся непасрэдна на грамадсшя патрэбы, напрыклад, на вядзенне войн супраць непрыяцеля. Так, баяры раілі Вялікаму князю Уладзіміру Святаслававічу вызначыць віры «... то на оружьи и на коних буди» [1, с. 104].

У X ст. падатак, яш спаганяуся з насельнщтва пераможаных плямёнау і дзяржау, называуся «даніна» ці «уклад». Так, у мірным дагаворы князя Алега з Візантыяй 907 г. прадугледжвалася грашовая выплата умм удзельнікам паходу: «. и запаведа Олег дати воем 2000 корабль по 12 гривен на ключь и потом дати уклады на рускыя грады: первое на Киев, таже на Чернигов, на Переяславль, на Полтеск, на Ростов, на Любеч н на прочыя городы» [2, с. 11].

З XI ст. тэрмш «данша» канчаткова замацоуваецца за унутрыдзяржаунай подаццю. Збор даншы з насельніцтва, на тэрыторып якой уладарыу князь, называуся «палюддзем». Дружыннікі таксама атрымлівалі ад князя права збіраць даншу і «карміцца» з той щ іншай воласці. Так, яшчэ да з'яулення буйнога землеуладання у дзяржавах-княствах усходшх славян узнікалі прыкметы васальнай залежнасці, што азначала права атрымання дружыннікамі даніны з пэунай тэрыторыі. У якасці васала Вялшага князя дружыннікі неслі службу за «лен» [3, с. 19].

З XII ст. распаусюджанай з'явай стала княскае землеуладанне і княсшя сёлы, узнікае баярскае і манастырскае землеуладанне. Менавіта таму з гэтага часу збор падаткау набывае мстэмны характар. Адзінкай падаткаабкладання з'яуляуся «дым», яш азначау надзел зямл^ якую апрацоувау адзін гаспадар. На тэрыторып Беларум падымная подаць захоувалася працяглы гістарычны перыяд (прыблізна да XVI ст.) і была адноулена у якасці асноунага дзяржаунага пазямельнага падатку у XVII ст. Размеркаванне па дымах ляжала на самім насельнщтве, а дзяржава вызначала дашну па пагостах (сельсшх абшчынах). Колькасць даніны з пагоста прызначалася у залежнасці ад яго памеру і багацця. Яна спаганялася спецыяльнымі зборшчыкамі, якія прызначал^я князем.

Данінай абкладаліся толькі сяляне-землеуладальншь Беззямельныя сяляне (кутнікі, каморшш), якія не мелі свайго жылля, а займалі камору ці кут у хаце заможнага селяшна, на якога працавалЬ абкладаліся асобым падаткам «па сіле», «хто што можа». БабылЬ якія выконвалі розныя работы у двары феадала, наогул вызвалял^я ад пабору [4, с. 275]. У раншм сярэдневякоуі даніна намла у асноуным натуральны характар і была прадстаулена мёдам, шкурамі пушных звяроу, зернем, ільном, хатняй жывёлай і інш. Разам з тым мела месца і грашовая данша. Так, «Аповесць мінулых гадоу» паведамляе, што князь Алег брау з радзімічау па шэлягу ад рала (адзшка абкладання, тоесная «дыму») [1, с. 106]. Ташм чынам, першапачаткова данша вызначалася у замежных грошах, а з X ст. грашовай адзшкай становщца грыуна.

У перыяд ^навання дзяржау-княствау крыніцай даходу бы^ і шматлікія пошліны. Так, у мэтах развщця гандлю спаганялася «вага і мера», за паслуп з боку дзяржавы у перавозцы тавара па рэках і волаках спаганяуся «перавоз», за увоз таварау шшаземнага купца на тэрыторыю дзяржавы - «мыта», за месца для захавання тавара - «гасцшная данша». Найважнейшай крынщай даходау дзяржавы быт судовыя пошліны - «віра», «продажа», «памочнае», «жалезнае».

Парадак спагнання пошлш можна прасачыць на падставе такога вядомага прававога акта, як «Дагавор Смаленскага, Віцебскага

і Полацкага княстваў з Рыгай, Готландскай зямлёй і нямецкімі гарадамі 1229 г.». Спагнанне пошлш за узважванне тавара ускладалася на царкву, дзе знаходзшася мера вагі «капь»: «Аще вощный пуд исказиться, лежить капь во святш Богородици» [5, с. 22]. Аналіз норм дагавора дае падставу сцвярджаць, што пошлшы не заусёды насілі грашовае вымярэнне, а маглі замяняцца яшмЬнебудзь рэчамі - падарункамі. Артыкул 35 Дагавора 1229 г. у Готландскай рэдакцып замацоувае норму, згодна з якой «... гость немечкый в городе дати им Княгини постав гастины, тиоуноу на Волоце дати роукавице, ажбы товар пьревьзл без держания» [5, с. 22]. Адзначаны нарматыуны прававы акт вызваляу ад выплаты мыта нямецкіх купцоу за праезд ад Рыгі да Смаленска, а смаленсшх, віцебскіх і полацкіх купцоу - да Рыгк «... не надобе мыто с Готьскага берега н до Риге, а из Риги до Смоленьска». Баш, яшя падпісалі дагавор, вызвалял^я таксама ад выплаты судовай пошлшы у выпадку звяртання у суд: «... русину же не дати пересуда ни в Риге ни на Готьскам береге ни Немчичю же платити пересуда в Смаленьске» [5, с. 22].

Як бачым, на раншм этапе ^навання дзяржавы яе даход фармЬ руецца за кошт часовых і надзвычайных зборау з насельнщтва крашы і пераможаных народау. Па меры удасканалення і развіцця дзяржаукняствау справа спагнання даншы і пошлін паступова упарадкоуваецца, замацоуваюцца арганізацыйныя формы абкладання насельніцтва. Зборы з насельнщтва набываюць рэгулярны характар і становяцца асноУнымі крыніцамі фарміравання даходау дзяржавы. Разам з тым юрыдычнага замацавання даніна не атрымала, а спаганялася на падставе звычаяу. Парадак збору пэуных пошлін рэгулявауся гандлёвымі дагаворамі XIII-XIV стст. Апошшя мелі агульнаабавязковы характар для купцоу, яшя займалкя міжнародным гандлем.

### Л1таратура


1. *Владимирский-Буданов, М.* Обзор истории русского права / М. Владимирский-Буданов. - Ростов н/Д, 1995. - 640 с.
2. Дагаворы і граматы як крышца беларускага феадальнага права: вучэб. дапам. / Я. Юхо, А. Абрамовіч, Т. Доунар, У. Сатолш. - Мінск, 2000. - 127 с.
3. *Вшнеуст, А. Ф.* Исторыя дзяржавы і права Беларусь вучэб. дапам. / А. Ф. Вшнеускь - Мшск, 2000. - 319 с.
4. *Довнар-Запольский, М. В.* История Белоруссии / М. В. Довнар-Запольский. - 2-е изд. - Минск, 2005. - 680 с.
5. *Вшнеуст, А. Ф.* Исторыя дзяржавы і права Беларуа у дакументах і матэрыялах (са старажытных часоу да наш^гх дзён): вучэб. дапам. / А. Ф. Вшшеуст, Я. А. Юхо; пад агульнай рэд. А. Ф. Вшнеускага. - Мшск, 2003. - 320 с.